# 25 СНЕЖНЯ—XXIX ГАРАДСКАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ.

# ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ЯЕ ДЭЛЕГАТАМ!

Евгений НЕФЕДОВ.

## АНКЕТА

— Откуда начало берешь, комсомол?
— Оттуда, где, строй сокрушая вчерашний,
вставала эпоха с винтовкой и шашкой,
и знамя сияло, как солнце само!
— Откуда ты силу берешь, комсомол?
— Оттуда, где снег обжигал наши лица,
но шахты и домны сумели родиться,
железные, как поколенье само.
— Откуда ты смелость берешь, комсомол?
— Оттуда, где небо гудело набатом
и грудью на танки вставали ребята,
великие, словно бессмертье само.
— Откуда ты гордость берешь, комсомол?
— Оттуда, где мне покорились навеки
простор целины и сибирские реки,
могучие, как дерзновенье само.
— Откуда ты юность берешь, комсомол?
— Оттуда, где с первым посланцем планеты
в далёкую даль стартовала ракета,
прекрасная, как вдохновенье само.
— Откуда ты счастье берешь, комсомол?
— Оттуда, где нет нашим планам предела
и партии ленинской правое дело
живёт во мне вечно, как серце само!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯР ЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 34 (594) | Субота, 22 снежня 1984 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## ГЭТА НАША З ТАБОЙ БІЯГРАФІЯ

⊙ На XXIX гарадскую камсамольскую канферэнцыю выбрана 779 дэлегатаў. Яны прадстаўляюць 521 пярвічную камсамольскую арганізацыю, якія налічваюць у сваіх радах 90496 членаў ВЛКСМ.

⊙ 26 дэлегатаў канферэнцыі маюць урадавыя ўзнагароды.

⊙ У гонар 60-годдзя прысваення камсамолу імя У. І. Леніна 108 дэлегатаў узнагароджаны знакам ЦК ВЛКСМ «60 гадоў з імем У. І. Леніна».

⊙ 314 дэлегатам прысвоена ганаровае званне «Ударнік камуністычнай працы», 74 — узнагароджаны граматамі ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ, 163 — знакам ЦК ВЛКСМ «Малады гвардзеец пяцігодкі», 15 — знакам ЦК ВЛКСМ «Майстар — залатыя рукі», 121 — граматамі абкома камсамола, 145 — гаркома камсамола.

⊙ 298 дэлегатаў маюць вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю, 431 — сярэднюю адукацыю.

⊙ 55,8% дэлегатаў — члены і кандыдаты ў члены КПСС.

⊙ Датэрмінова выканалі заданні пяцігодкі 5 дэлегатаў канферэнцыі.

⊙ Сярод дэлегатаў—32 дэпутаты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

⊙ Сярод дэлегатаў канферэнцыі — 62 студэнты.

## УЗНАГАРОДА—СТУДЭНТУ

Хвалюючым і радасным стаў дзень 20 снежня для студэнта-першакурсніка эканамічнага факультэта камсамольца Яўгена Белаша. Перад пачаткам заняткаў у адной з аўдыторый сабраліся яго таварышы па вучобе, выкладчыкі эканомфака, рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў, прадстаўнікі гарваенкамата.

Ва ўрачыстай абстаноўцы Я. Белашу быў уручаны медаль «За баявыя заслугі», якім ён, удзельнік абмежаванага кантынгенту Узброеных Сіл СССР у Афганістане, радавы запасу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджаны за мужнасць, адвагу, знаходлівасць і кемлівасць у выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

# З ІНІЦЫЯТЫВАЙ І ТВОРЧАСЦЮ

Я. АСТРАКОЎ,
першы сакратар
ГК ЛКСМБ.

Няма такой справы, якая б аказалася не пад сілу юнакам і дзяўчатам з камсамольскімі значкамі на грудзях. Яны заўсёды на пярэднім краі, там, дзе цяжка, дзе патрэбны іх працавітыя рукі, агонь маладых сэрцаў, запал і энтузіязм.

Выдатнымі справамі сустракаюць камсамольцы ардэнаноснага г. Гомеля XXIX гарадскую справаздачна-выбарную канферэнцыю. Важкі іх уклад у рэалізацыю задач 11-й пяцігодкі. Звыш 37 тысяч юнакоў і дзяўчат актыўна ўдзельнічаюць у патрыятычным руху «11-й пяцігодцы — ўдарную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!» У руху за камуністычныя адносіны да працы ўдзельнічаюць 60 тысяч камсамольцаў і маладых работнікаў вытворчасці, 15 тысяч з якіх з'яўляюцца ўдарнікамі камуністычнай працы, 160 камсамольска-маладзёжных калектываў удастоены звання «Калектыў камуністычнай працы».

Нам прыемна сёння назваць пераможцаў па выніках III квартала — камсамольска-маладзёжны калектыў брыгады станочнікаў цэха № 5 завода імя С. М. Кірава (брыгадзір Г. Сталярова, групкамсорг Е. Казлова), камсамольска-маладзёжны калектыў канструктарска-вытворчага аддзела завода радыётэхналагічнага аснашчэння (брыгадзір Т. Губараў, групкамсорг В. Цурко), змену «А» цэха склада-на-змешаных мінеральных угнаенняў хімічнага завода імя 50-годдзя ўтварэння СССР (начальнік цэха В. Д. Жосткін, камсорг В. Казінец), камсамольска - маладзёжны калектыў Гомельскага вытворчага галантарэйнага аб'яднання (брыгадзір Г. Куляшова, камсорг Н. Абрамовіч), камсамольска - маладзёжны калектыў БУ-107 вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд» (брыгадзір Л. Капуеўская, групкамсорг Р. Пархоменка), КМК магазіна № 38 Чыгуначнага райхарчгандлю (брыгадзір П. Федаранава, групкамсорг Л. Сяўрук), камсамольска-маладзёжны экіпаж аўтакалоны 2443 у складзе М. Хорсуна і А. Дрыга.

Рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы 40-годдзя Перамогі, XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, камсамольска - маладзёжны калектыў змены «А» цэха складана-змешаных мінеральных угнаенняў хімічнага завода імя 50-годдзя ўтварэння СССР выступіў з ініцыятывай — выканаць пяцігодку да Дня Перамогі, 40 камсамольска-маладзёжных калектываў горада падтрымалі гэты патрыятычны пачын.

Бюро ГК ЛКСМБ адобрыла ініцыятыву камсамолкі швачкі-матарысткі фабрыкі «8 Сакавіка» Святланы Краскевіч, якая абавязалася выканаць пяцігодку да XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

Актыўна ўключыліся ў спаборніцтва юнакі і дзяўчаты горада, камсамольска-маладзёжныя калектывы па звышпланаваму павышэнню прадукцыйнасці працы на 1 працэнт да дадатковага паніжэння сабекошту прадукцыі на 0,5%.

Павысілася роля штабоў і пастоў «Камсамольскага пражэктара» у барацьбе за эканомію і беражлівасць, адшуканне і выкарыстанне рэзерваў вытворчасці. 3771 штаб і пост «Камсамольскага пражэктара», 9938 пражэктараў удзельнічаюць у стварэнні камсамольскага фонда эканоміі і беражлівасці.

Выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, камсамольцы горада настойліва авалодваюць ведамі ў сістэме камсамольскай палітычнай вучобы і эканамічнай адукацыі. У бягучым годзе 19119 членаў ВЛКСМ займаюцца ў сістэме камсамольскай палітычнай адукацыі, партыйнай вучобы — 1544 чал., 12711 чалавек — у школах камуністычнай працы.

Эфектыўна, на належным арганізацыйным і ідэйна-тэарэтычным узроўні праводзіцца палітычная вучоба ў камсамольскіх арганізацыях аб'яднанняў «Камінтэрн», «Гідрааўтаматыка», завода «Крышталь», радыёзавода імя 60-годдзя ўтварэння СССР.

Далейшае развіццё атрымала інтэрнацыянальнае выхаванне. Камсамольцы і моладзь горада пералічылі ў фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які адбудзецца летам у г. Маскве, звыш 100 тысяч рублёў.

Ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі камсамольцы горада прымаюць актыўны ўдзел у навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Толькі ў бягучым годзе юнакамі і дзяўчатамі пададзена звыш 3,5 тыс. рацыяналізатарскіх прапаноў з эканамічным эфектам 2019 тысяч рублёў. Добра наладжана гэта работа ў камсамольскіх арганізацыях радыёзавода, завода вымяральных прыбораў, завода «Электраапаратура».

Важкі ўклад у рашэнне задач XI пяцігодкі ўносяць студэнцкія будаўнічыя атрады. Байцамі СБА за час працоўных семестраў трох апошніх гадоў асвоена больш 17 млн. рублёў капітальных укладанняў.

Удасканальваюцца формы і метады працоўнага навучання і выхавання школьнікаў. У пятай працоўнай чвэрці «Мая праца ўліваецца ў працу маёй рэспублікі» бягучага года прыняло ўдзел звыш 11 тысяч старшакласнікаў. Працоўнымі калектывамі вучняў выканана работ на суму 388 тысяч 700 рублёў.

Камсамольцы, моладзь горада, выконваючы свой патрыятычны абавязак і пацвярджаючы бязмежную адданасць справе Леніна, партыі, народу прыкладуць усе сілы, веды для паспяховага ажыццяўлення рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, ударнай працай сустрэнуць XXVII з'езд партыі, 40-годдзе Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй.



Камсамольска-маладзёжная брыгада завода вымяральных прыбораў, якую ўзначальвае лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Уладзімір Грамыка (на здымку ў цэнтры другога рада), пастаянна дабіваецца высокіх працоўных паказчыкаў. Першай на заводзе ёй былі даверany выпуск плат для новых прыбораў, і брыгада выдатна справілася з заданнем. Члены камсамольска-маладзёжнага калектыву пастаянна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Росту прадукцыйнасці працы садзейнічае стварэнне брыгад тэхнічнай творчасці, рацыяналізатарская работа.

Калектыў брыгады прыняў павышаныя сацыялістычныя аба-[illegible] па дастойнай сустрэчы 40-годдзя Перамогі савец-

«Задача Союза молодежи — поставить свою практическую деятельность так, чтобы, учась, организуясь, сплачиваясь, борясь, эта молодежь воспитывала бы себя и всех тех, кто в ней видит вождя, чтобы она воспитывала коммунистов».

В. И. ЛЕНИН.

(«Задачи Союза Молодежи»).

# «На рахунак фестывалю»

Такія паметкі зрабілі на сваіх маршрутных лістах брыгады камсамольска-маладзёжнай калоны машыніста-інструктара А. Міхальчанкі. Яна аб'ядноўвае 20 лепшых экіпажаў. На камсамольскім сходзе чыгуначнікі выступілі з ініцыятывай: «Кожнай брыгадзе зрабіць паездку на сэканомленым паліве, а сродкі за яе пералічыць у Фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве». Першым здаў свой маршрутны ліст сакратар камсамольскай арганізацыі цэха эксплуатацыі Мікалай Мяцеліца. Разам з памочнікам Уладзімірам Васілеўскім ён правёў цяжкавагавы састаў на ўчастку Калінкавічы — Гомель. Яго прыкладу паследавалі камсамольска - маладзёжныя брыгады Уладзіміра Карнеева, Сяргея Луцэнкі і інш.

Тое, што менавіта гэты камсамольска-маладзёжны калектыў выступіў ініцыятарам рэйсаў на сэканомленым паліве і пералічэння заробленых сродкаў у фонд фестывалю, у лакаматыўным дэпо нікога не здзівіла. Гэта калона ўжо некалькі кварталаў запар выходзіць пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва, укараняе ў сваю практыку передавы вопыт. Толькі за 11 месяцаў бягучага года калонай праведзена 476 цяжкавагавых саставаў, у якіх перавезена звыш мільёна тон народнагаспадарчых грузаў. Сапраўднымі майстрамі ваджэння цяжкавагавых саставаў, акрамя названых таварышаў, сталі Мікалай Лаўшук, Уладзімір Прахарэнка і іншыя машыністы.

Камсамольцаў і моладзь калоны вызначае не толькі высокапрадукцыйная праца, але і іх актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. 7 чалавек з'яўляюцца актыўнымі членамі аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў, 4 — уваходзяць у састаў камсамольскага бюро цэха эксплуатацыі і камітэта камсамола дэпо.

Дастойны ўклад у скарбонку фестывалю ўнеслі камсамольцы і моладзь цэха рамонту. Адной з лепшых стала змена майстра Міхаіла Аронава. За кошт сэканомленых матэрыялаў і запчастак яна адрамантавала ў лік фестывалю цеплавоз Т-3. Моладзь прымае плённы ўдзел у руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Сёлета маладымі рацыяналізатарамі дэпо распрацавана і ўкаранёна 81 прапанова з эканамічным эфектам звыш 41 тысячы рублёў. Лепшымі рацыяналізатарамі з'яўляюцца члены камсамольска-маладзёжнага калектыву электра-апаратнага аддзялення Мікалай Бадзенка, Юрый Караткевіч, Аляксандр Яўсеенка. Значна перавыканаў асабісты гадавы вытворчы план малады спецыяліст Уладзімір Лесаў.

**А. ХАРАНЕНКА,**
**сакратар камітэта камсамола лакаматыўнага дэпо Гомель.**

# НАС МЭТАЙ АДЗІНАЙ З'ЯДНАЎШЫ,

## РАЎНЕННЕ—НА КАМУНІСТАЎ

Каля 25 тысяч юнакоў і дзяўчат Чыгуначнага раёна ўключыліся ў рух «XI пяцігодцы — ударную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!». Цяпер кожны чацвёрты член ВЛКСМ з'яўляецца ўдарнікам камуністычнай працы. Мы па праву ганарымся такімі камсамольцамі як Сяргей Ганчароў, Сяргей Губкін, Таццяна Камень, Наталля Карончык, Анатоль Гаўрыленка, Васіль Емяльянцаў, Анатоль Кротаў, Валерый Атрошчанка, Таісія Саўчыц.

Прыклад творчых, зацікаўленых адносін да працы паказваюць камсамольска-маладзёжныя калектывы. Цяпер іх у раёне 403. Яны створаны ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і аб'ядноўваюць у сваіх радах каля 6 тысяч юнакоў і дзяўчат. Лепшымі сталі калектывы, якія ўзначальваюць маладыя камуністы М. Макаранка ў аб'яднанні «Гомсельмаш», А. Панюкоў на заводзе радыётэхналагічнага аснашчэння, Д. Цімохаў у аб'яднанні «Гідрааўтаматыка», Т. Саўчыц на фабрыцы цацак. Яны ў ліку першых перайшлі на брыгадную форму арганізацыі працы.

Камсамольцы нашага раёна, як і ўся моладзь краіны, шырока разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. 12 камсамольска-маладзёжных калектываў і каля тысячы маладых рабочых абавязаліся выканаць пяцігадовае заданне да Дня Перамогі.

Камітэты камсамола раёна ўдзяляюць вялікую ўвагу руху за камуністычныя адносіны да працы. Цяпер у ім удзельнічае 8 тысяч юнакоў і дзяўчат. За тры апошнія гады ў паўтара раза скарацілася колькасць моладзі, якая не выконвае нормы выпрацоўкі, падвоіліся рады рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Для павышэння прафесіянальнага майстэрства шырока праводзяцца конкурсы на званне «Лепшы па прафесіі».

Тэрыторыя нашага раёна з'яўляецца вялікай будаўнічай пляцоўкай. У бягучай пяцігодцы вялікага поспеху дасягнуў калектыў ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд». Цяпер у аб'яднанні працуе 25 камсамольска-маладзёжных калектываў. Лепшым з іх з'яўляецца калектыў, які ўзначальвае лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі Аляксандр Ткачэнка. Плённа працуюць таксама КМК, узначальваемыя Аляксандрам Жосткіным, Мікалаем Басовічам і многія іншыя.

На ўзводзімых аб'ектах аб'яднання «Гомсельмаш» вядуць работы сфарміраваныя калектывы многіх прадпрыемстваў і арганізацый горада. З лепшага боку зарэкамендавалі сябе прадстаўнікі камсамольскіх арганізацый завода «Электраапаратура», паліклінікі № 1, БІІЧТу, чыгуначнага тэхнікума, тэхнічных вучылішчаў №№ 17, 20, 35, завода радыётэхналагічнага аснашчэння. Сёлета на «Гомсельмашы» працавала ў цэлым каля 2 тысяч 400 студэнтаў і навучэнцаў нашага раёна.

Камсамольцы і моладзь уносяць свой важкі ўклад у рэалізацыю Харчовай праграмы СССР. Сёлета іх сіламі для грамадскай жывёлагадоўлі было нарыхтавана 2 тысячы 361 тона сена і больш 8 тысяч тон зялёнай масы.

Для моладзі сапраўднай школай працоўнай загартоўкі і выхавання сталі студэнцкія атрады. Мінулым летам з ліку студэнтаў факультэта кіравання працэсамі перавозак БІІЧТу ўпершыню быў сфарміраваны навукова-вытворчы атрад. У перыяд вучобы ён займаўся тэарэтычнай распрацоўкай аўтаматызаванай сістэмы птушкафабрыкі ў пасёлку «Камунар» Буда-Кашалёўскага раёна, а ў працоўным семестры — падрыхтоўкай вытворчых пляцовак пад мантаж абсталявання. Эканамічны эфект ад укаранення студэнцкай навуковай распрацоўкі склаў 105 тысяч рублёў.

У нашым раёне шырока распаўсюджана настаўніцтва. У гэтым руху цяпер удзельнічае каля 2800 вопытных кадравых рабочых і спецыялістаў. Сярод іх такія вядомыя настаўнікі працоўнай моладзі як Герой Сацыялістычнай Працы П. К. Кавалёў з «Гомсельмаша», які падрыхтаваў ужо 32 маладыя рабочыя, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР У. М. Губанаў з гэтага ж аб'яднання і многія іншыя.

Усе поспехі камсамола мы звязваем з партыйнымі клопатамі аб моладзі. І яна поўная рашучасці працаваць на росквіт нашай сацыялістычнай Айчыны яшчэ з большай аддачай сіл і ведаў.

**А. ХОМІЧ,**
**першы сакратар Чыгуначнага РК ЛКСМБ.**

## СЭРЦАМ ДАКРАНУЛІСЯ ДА ПОДЗВІГУ

Новы прыліў працоўнай энергіі і творчых сіл у камсамольцаў выклікала падрыхтоўка да 40-годдзя Вялікай Перамогі і XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які адбудзецца ў Маскве. У нашым раёне ў фонд фестывалю ўжо пералічана больш 8 тысяч рублёў.

Звыш 400 камсамольцаў і 19 камсамольска-маладзёжных калектываў датэрмінова завяршылі заданні чатырох гадоў пяцігодкі. Агранщчык завода «Крышталь» Мікалай Бандарэнка ўжо ў жніўні рапартаваў аб завяршэнні асабістай пяцігодкі. Ён даў слова да 115-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна завяршыць яшчэ адно гадавое заданне.

На працоўным календары швачкі-матарысткі галантарэйнага аб'яднання Валянціны Адасенка — сакавік 1986 года.

Камсамольска - маладзёжны калектыў цэха высокага друку папярова-лесахімічнага завода (брыгадзір Міхаіл Грабавец, а групкамсорг Сяргей Самойленка) выканаў план чатырох гадоў да 41-й гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры гэтым сэканомлена матэрыялаў, з якіх можна выпусціць 10 тысяч умоўных адзінак шпалер.

На заводзе «Крышталь» у састаў 34 камсамольска-маладзёжных калектываў ганаровым членам уключаны герой-зямляк Юрый Шандалаў. На яго імя зароблена і пералічана ў Фонд міру звыш 10 тысяч рублёў. У гэтай ініцыятыве стала відавочнай жывая сувязь часоў, пераемнасць пакаленняў, яе вялікая выхаваўчая сутнасць.

На працягу многіх гадоў вялікую ваенна-патрыятычную работу праводзіць атрад разведчыкаў ваеннай славы «Пошук», які створан пры музеі двойчы Героя Савецкага Саюза П. Я. Галавачова ў ГПТВ-56, узначальваемы М. Р. Горавым. Атрад устанавіў імёны 51 раней невядомага воіна і партызана, якія загінулі ў баях за Радзіму, каля 400 месц гібелі авіяцыйных экіпажаў на тэрыторыі Гомельшчыны. Камсамольцы ўстанавілі 12 мемарыяльных знакаў і 2 помнікі. На месцы гібелі 15 авіяэкіпажаў зроблены раскопкі і астанкі савецкіх воінаў перанесены ў брацкія магілы.

Вынікі пошуку прадстаўлены ў мемарыяльным музеі і ў зале Камсамольскай славы вучылішча. Піянерскія атрады школ раёна, лепшыя групы прафтэхвучылішча № 56 спаборнічаюць за права насіць імёны герояў, якія ўстаноўлены атрадам разведчыкаў. Гэты атрад з'яўляецца пераможцам IX і X этапаў Усесаюзнага паходу па месцах славы КПСС і савецкага народа.

Да 40-годдзя вызвалення г. Гомеля ў нашым раёне быў арганізаваны аўтапрабег па гераічных мясцінах. У ім прынялі ўдзел камсамольскія арганізацыі СШ № 15 і ГПТВ № 113. З брацкіх магіл Гомельшчыны ў капсулы сабрана свяшчэнная зямля.

Пошук новых фактаў гераізму савецкіх людзей, выхаванне ў піянераў і школьнікаў любві да Радзімы, таварышаў, ветэранаў рэвалюцыі, вайны і працы вядзе народны музей баявой і працоўнай славы СШ № 4, дзейнасць якога абагулена на пасяджэнні бюро райкома камсамола. Больш чым за 10 гадоў пошукавай работы, перапіскі з ваеннымі архівамі і музеямі, дзяржаўнымі бібліятэкамі тут сабрана шмат экспанатаў. Экспазіцыя музея расказвае аб барацьбе нашых землякоў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго зала стала месцам пастаянных сустрэч камсамольцаў і піянераў з ветэранамі вайны, героямі працы. У картатэцы музея ёсць звесткі больш чым аб тысячы ветэранах.

У знамянальным для савецкага народа 1985 годзе пры ўдзеле камсамольцаў і моладзі ў Навабеліцы будзе закладзен парк Перамогі.

Сустракаючы слаўны юбілей, кожны юнак і дзяўчына раёна сваім сэрцам дакранаюцца да нязгасных старонак гераізму савецкага народа.

**У. ЖУКАЎ,**
**першы сакратар Навабеліцкага РК ЛКСМБ.**



Невялікі стаж работы ў Святланы Жураўлёвай — швачкі-матарысткі панчошна-трыкатажнай фабрыкі «8 Сакавіка». На прадпрыемстве дзяўчына працуе з верасня 1983 года. Але за гэты кароткі час за самаадданую працу камсамолцы прысвоена званне «Лепшая маладая рабочая».

НА ЗДЫМКУ: С. ЖУРАЎЛЕВА.

## І МАЙСТЭРСТВА, І НАТХНЕННЕ

**Калі стала вядома, што пераможцам конкурсу 1984 года «Лепшы рацыяналізатар СКТБ» стаў член камітэта камсамола нашага канструктарскага бюро сейсматэхнікі І. Сільчанка, гэтаму не здзівіліся. Перамога заўсёды прыходзіць да таго, хто знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку.**

Калектыў ГСКТБ СТ — адзін з самых маладых у Гомелі. Тут распрацоўваюцца складаныя машыны для сейсмічнага даследавання зямной кары з мэтай вызначэння месца знаходжання нафты, газа, іншых карысных выкапняў.

Важкі ўклад у іх распрацоўку ўносяць камсамольцы. У бягучым годзе маладымі спецыялістамі і рабочымі пададзена 51 заяўка на мяркуемыя вынаходніцтвы. Больш дзесяці тысяч рублёў склаў эканамічны эфект ад укаранення 72 рацпрапаноў.

Актыўна ўдзельнічаюць ва Усесаюзным аглядзе навукова-тэхнічнай творчасці пад дэвізам «Пяцігодцы — ударную працу, майстэрства і пошук маладых!» Е. Насыбулін, В. Цымерман, В. Макаранка, І. Саўцін, Б. Кофман і многія іншыя маладыя канструктары, тэхнолагі, рабочыя.

Навейшая тэхніка, створаная ў СКТБ, паспяхова працуе сёння ў Башкірыі, Комі АССР, Пярмі, Цюмені і многіх іншых геафізічных трэстах краіны. У гэтых машынах цяпло нашых рук.

**С. САМАРЧАНКА,**
**сакратар камітэта камсамола ГСКТБ СТ.**

# НА ПОДЗВІГ ВЯДЗЕ КАМСАМОЛ!

## ПРАВАФЛАНГОВЫЯ ПЯЦІГОДКІ

ДОБРАЯ слава ў аб'яднанні «Гомсельмаш» ідзе аб камсамольска-маладзёжнай брыгадзе ўчастка зборкі рэжучага барабана цэха жняярак. Калектыў адным з першых у аб'яднанні выступіў з ініцыятывай выканаць да 40-годдзя Вялікай Перамогі заданні XI пяцігодкі і сёння працуе ўжо ў лік верасня 1985 года.

У брыгадзе сем слесараў-зборшчыкаў. Працоўная біяграфія калектыву пачалася ў 1972 годзе, і ўвесь гэты час ён працуе ўстойліва, дабіваецца высокіх вытворчых паказчыкаў. Па выніках работы ў 10-й пяцігодцы брыгадзе на вечнае захоўванне ўручаны Чырвоны сцяг ЦК ВЛКСМ «Героі пяцігодак, ветэраны працы — лепшаму камсамольска-маладзёжнаму калектыву». Па выніках 1983 года калектыў прызнаны лепшым па Міністэрству машынабудавання для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці.

Сваімі поспехамі брыгада ў многім абавязана пераходу на метад брыгаднага падраду. Цяпер матэрыяльная і маральная адказнасць за агульныя вынікі работы ўскладзена на кожнага яе члена. У выніку ўзрасла прадукцыйнасць працы, павялічылася заработная плата, скараціліся страты рабочага часу.

Накіроўвае работу савет брыгады, у які ўваходзяць тры чалавекі. Размеркаванне калектыўнага заработку паміж членамі калектыву ажыццяўляецца па каэфіцыенту працоўнага ўдзелу. Рабяты імкнуцца працаваць лепш, больш смела звяртаюцца да вывучэння сумежных прафесій, павышаюць сваё прафесіянальнае майстэрства.

Як зазначае брыгадзір Аляксандр Хамазюк, калектыўная і маральная адказнасць карэнным чынам змяніла адносіны да працы. Самі рабяты лічаць, што галоўная перавага брыгаднага метаду — гэта педагагічны фактар, стварэнне здаровага маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве. На сходах камсамольцаў брыгады абмяркоўваюцца не толькі пытанні вытворчасці, але і ўдзел кожнага ў выкананні грамадскіх даручэнняў. Для ўсёй брыгады агульным даручэннем стала шэфства над групай слесараў базавага ГПТВ—6 металістаў.

Павышаная ўвага ўдзяляецца ў брыгадзе навічкам. За кожным з іх замацаваны настаўнік, які добразычліва дапамагае пачынаючым рабочым паспяхова авалодваць спецыяльнасцю. Аляксандр Летчакоў, напрыклад, прыйшоў у брыгаду пасля службы ў арміі. З дапамогай таварышаў па брыгадзе асвоіў прафесію і цяпер пастаянна перавыконвае зменнае заданне. Ён — пераможца цэхавага сацыялістычнага спаборніцтва на званне «Лепшы малады рабочы».

Так як аплата працы праводзіцца па выніках работы ўсёй брыгады, то ў больш кваліфікаваных слесараў з'явілася зацікаўленасць у у перадачы свайго вопыту маладым рабочым. У выніку многія слесары павысілі свой кваліфікацыйны разрад.

Рабяты лічаць, што эфект ад брыгаднай формы будзе яшчэ вышэйшым, калі больш дакладна вырашаць арганізацыйныя і тэхналагічныя пытанні. Трэба наладзіць аператыўную работу тых звенняў, ад якіх залежыць праца брыгады. Менавіта таму членаў брыгады можна бачыць на змежных участках цэха. Акрамя асноўнай работы выконваецца і дапаможная, каб можна было абысціся без падмены і вынікі працы былі вышэйшымі. Напрыклад, брыгадзір выконвае пры неабходнасці і аперацыі штампоўшчыка, свярлоўшчыка, працяжніка. Справы брыгады не абмяжоўваюцца участкам, цэхам. Калі ў аб'яднанні адчуваўся востры недахоп штампоўшчыкаў, лепшыя рабочыя брыгады групкамсорг Васіль Гаўрыленка і Сяргей Шведаў былі ў ліку першых, хто пайшоў на адстаючы ўчастак у прэсава-нарыхтоўчы цэх.

Жаданне і гатоўнасць дапамагчы—у характары кожнага члена перадавой брыгады. У гэтым і сакрэт яе поспеху.

**А. КАЦОРА,**
**сакратар камітэта камсамола вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш».**

## МІР МАЦУЕМ ПРАЦАЙ

УДЗЕЛЬНІЧАЮЧЫ ў будаўнічых атрадах, студэнты ўносяць сваёй працай канкрэтны ўклад ва ўмацаванне міру. Працоўнае выхаванне — важнейшы напрамак работы нашага камітэта камсамола.

Зводны студэнцкі атрад ГДУ мінулым летам аб'ядноўваў 1189 чалавек. Было сфарміравана 50 атрадаў. Імі асвоена капіталаўкладанняў больш чым на адзін мільён рублёў. Байцы атрадаў працавалі на будаўніцтве аб'ектаў жыллёвага, культурна-бытавога, вытворчага, сельскагаспадарчага і меліярацыйнага прызначэння.

Атрады ўніверсітэта сёлета працавалі на Гомельшчыне і ў Якуцкай АССР, у Пскоўскай вобласці і Стаўрапольскім краі, на зямлі братняй Чэхаславакіі.

Ударная праца байцоў СБА непарыўна звязана з актыўнай агітацыйна-прапагандысцкай, культурна-масавай і ваенна-патрыятычнай работай. Было прачытана 342 лекцыі, аматары мастацкай самадзейнасці выступілі з 229 канцэртамі, аказана разнастайная дапамога сельскім школам. Студэнты праяўлялі вялікія клопаты аб ветэранах вайны і працы.

Камсамольцы універсітэта з вялікай пашанай адносяцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым годзе байцы СБА змагаліся за права прысваення атрадам імён герояў, залічэнне іх ганаровымі байцамі атрадаў. Ганаровымі байцамі атрадаў сталі Г. Дакутовіч, А. Дурагін, А. Ісачанка, І. Жалезнякоў, Е. Барыкін, В. Харужая, І. Антошкін, М. Сурначоў і многія іншыя. Заробленая на іх імя сума грошай была пералічана ў Савецкі Фонд міру.

Удзел у Маршы міру — сведчанне грамадзянскай і палітычнай сталасці ўдзельнікаў працоўнага семестра, іх салідарнасці з моладдзю краін, якія змагаюцца за сваю незалежнасць, супраць імперыялістычнай агрэсіі, каланіялізму і расізму. 18-га ліпеня ў атрадах быў праведзены Дзень ударнай працы ў фонд дапамогі моладзі развіваючыхся краін.

Сёлета зводным студэнцкім атрадам ГДУ ў Савецкі Фонд міру пералічана 30 тысяч 485 рублёў.

У год 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ва універсітэце быў створаны камуністычны атрад бязвыплатнай працы імя Ленінскага камсамола. Ён вёў рэканструкцыю музея народнай славы ў г. п. Акцябрскім, матэрыялы якога знаёмяць моладзь, усіх наведвальнікаў са слаўнай гісторыяй Рудабельскай рэспублікі. Уся заработная плата гэтага атрада пералічана ў Савецкі Фонд міру.

Мацнее дружба паміж студэнтамі ГДУ і сельскагаспадарчай акадэміі з г. Чэске-Будзеёвіцэ братняй Чэхаславакіі. На працягу многіх гадоў адбываецца абмен студэнцкімі атрадамі. Працуючы ў Чэхаславакіі, нашы студэнты шмат пазнаюць аб эканоміцы і культуры ЧССР, а чэхаславацкія сябры — аб першай у свеце Краіне Саветаў. Усё гэта садзейнічае ўмацаванню дружбы паміж народамі і міру на планеце.

**Г. ШАЛДУКОВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола ГДУ.**

## ЗА ГАНАРОВАЕ ПРАВА

XXIX справаздачна-выбарная гарадская камсамольская канферэнцыя праходзіць у юбілейным годзе, калі ўся перадавая моладзь, камсамольцы нашай краіны дастойна сустрэлі знамянальную падзею — 60-годдзе з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

Камсамольцы, моладзь з гонарам працягваюць слаўныя традыцыі старэйшых пакаленняў, па закліку партыі з энтузіязмам бяруцца за сур'ёзныя і складаныя справы.

Брыгада, у якой я працую, існуе каля двух гадоў. За гэты час калектыў набыў самастойнасць, дабіўся высокіх вытворчых паказчыкаў. У брыгадзе — 13 чалавек, яна з'яўляецца камсамольска-маладзёжнай. Наша моладзь даказвае, што яна ўмее працаваць нараўне з вопытнымі майстрамі. Зараз мы ўзводзім адзін з аб'ектаў вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш» — цэх жняярак. Рабяты добра разумеюць, што аб'ект вельмі важны ў народнагаспадарчым значэнні і стараюцца працаваць паударнаму. Вытворчыя заданні выконваюцца ў сярэднім на 115%.

Мы змагаемся за ганаровае права называцца «Брыгадай камуністычнай працы». Цяпер наш калектыў працуе ў лік сакавіка 1985 года. Наша брыгада выйшла пераможцам у гарадскім сацыялістычным спаборніцтве паміж будаўнічымі арганізацыямі г. Гомеля па дастойнай сустрэчы 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Усе члены нашага калектыву прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праходзяць ва ўпраўленні і ў аб'яднанні. Так, нашы камсамольцы ўдзельнічалі ў раённым турыстычным злёце, прысвечаным 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы шэфствуем над гарадскім Домам груднога дзіцяці, сёлета правялі два суботнікі па яго рамонту і добраўпарадкаванню тэрыторыі.

Асаблівымі клопатамі камсамольцы брыгады акружаюць маладых рабочых, якія прыходзяць да нас пасля заканчэння вучылішча. А рабяты стараюцца не адставаць ад сваіх настаўнікаў.

У нашым будаўнічым упраўленні № 107 адбыўся камсамольска-маладзёжны суботнік. Сродкі ад яго пералічаны ў фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у г. Маскве.

**А. СІГНЕЕЎ,**
**групкамсорг камсамольска-маладзёжнага калектыву мазаічнікаў-пліточнікаў БУ № 107 аб'яднання «Гомельпрамбуд».**

## ВАЖКІ ЎКЛАД

За дзевяць месяцаў бягучага года калектыў панчошна-трыкатажнай фабрыкі «8 Сакавіка» справіўся з павышанымі сацыялістычнымі абавязацельствамі. Па выніках рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва за трэці квартал фабрыцы прысуджана першае месца з уручэннем пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства лёгкай прамысловасці БССР і Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў работнікаў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці.

У дасягненнях фабрыкі немалая заслуга і моладзі, камсамольцаў. 13 маладых работніц да 7-га лістапада выканалі пяцігадовае заданне, 183 — план чатырох гадоў пяцігодкі. Кожная трэцяя маладая работніца валодае 2—5 сумежнымі аперацыямі. Ударна працуюць на вытворчасці, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці прадпрыемства швачка-матарыстка панчошнага цэха Наталля Чыкіда, сушыльшчыца палатна фарбавальнага цэха Ала Макаранка, швачка-матарыстка пашывачнага цэха № 2 Святлана Краскевіч і інш.

У нашай камсамольскай арганізацыі ёсць сапраўдныя лідэры. Галіна Палудзінская —адна з іх. Яна прыйшла на фабрыку ў 1977 годзе. Сваім стараннем, уменнем добрасумленна працаваць яна хутка заваявала аўтарытэт у калектыве. Пяты раз камсамольцы канвеера выбіраюць яе сваім важаком.

1985 год — год 40-годдзя Вялікай Перамогі, XII-га Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве, завяршальны год XI-ай пяцігодкі. Ударнай працай камсамольцы і моладзь фабрыкі рыхтуюцца сустрэць гэтыя знамянальныя даты. 108 маладых работніц пераглядзелі свае абавязацельствы.

Павышэнню прадукцыйнасці працы маладых рабочых дапамагае арганізацыя шэфства над навічкамі. Над маладымі работнікамі шэфствуюць 130 настаўнікаў. Сярод іх — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР вязальшчыца В. Я. Капытка, М. А. Плесская, А. П. Федзькіна, Н. А. Аляксеенка і многія іншыя. Прыемна адзначыць, што ў спаборніцтве «Лепшы настаўнік моладзі» выходзілі пераможцамі і маладыя работніцы Галіна Магер, Алена Карытка, Наталля Дземянкова.

**Л. КАВАЛЕВА,**
**сакратар камітэта камсамола фабрыкі «8 Сакавіка».**

## ПОПЛЕЧ З ГЕРОЕМ

Герой Савецкага Саюза, наш зямляк Ю. Шандалаў стаў для кожнага камсамольца завода «Крышталь» яркім прыкладам служэння Радзіме. З яго гераічным жыццём звярае свае справы моладзь прадпрыемства. У 34 камсамольска-маладзёжных калектывах завода маладыя рабочыя выконваюць працоўную норму за сябе і за героя. Гэта не проста натхнёная праца камсамольцаў, гэта імкненне звязаць з яго подзвігам кожны свой крок, сваё жыццё.

А пачалося ўсё ў снежні 1982 года, калі на пасяджэнні камітэта камсамола завода камсамольска-маладзёжны калектыў участка № 31 выступіў з ініцыятывай — уключыць у свой састаў Героя Савецкага Саюза Ю. Шандалава, а заробленыя грошы пералічваць у Савецкі Фонд міру. Ініцыятыву горача падтрымала ўся моладзь прадпрыемства. І цяпер многія маладыя рабочыя называюць сябе «шандалаўцамі». 11 тыс. рублёў — такі ўклад камсамольцаў і моладзі ў справу абароны міру.

Юнакі і дзяўчаты вядуць вялікую пошукавую работу, сустракаюцца з сябрамі і блізкімі Ю. Шандалава. Нядаўна на заводзе адбыўся вечар памяці героя. Камсамольцы запрасілі на яго сястру героя Р. А. Шандалаву, якая цікава расказвала пра жыццё брата.

На ўчастку № 31, калектыў якога першым уключыў у свой састаў героя-земляка, абсталяваны яго станок, на ім фотаздымак Ю. Шандалава з невялікім тэкстам. Гэты тэкст добра ведаюць усе камсамольцы прадпрыемства: «Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 мая 1946 года старшаму лейтэнанту Ю. А. Шандалаву пасмяротна прысвоіць званне Героя Савецкага Саюза».

Шандалаўскі рух — гэта часцінка вытворчых поспехаў усяго калектыву завода, які па выніках гарадскога сацыялістычнага спаборніцтва за трэці квартал бягучага года ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам ГК КПБ, выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў, і занесены на гарадскую Дошку гонару.

**М. ПРЫБЫЛЕВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола завода «Крышталь».**

*Харчовая праграма — справа кожнага*

# РУКАМІ ШЭФАЎ

Яшчэ ў пачатку года ўся заводская моладзь уключыла ў свае сацыялістычныя абавязацельствы і асабістыя комплексныя планы пункт: «Адпрацаваць два дні ў падшэфным калгасе ў нерабочы час...».

Шэфства над калгасам «1-ае Мая» мы пачалі толькі ў гэтым годзе, але ўжо паміж **нашымі калектывамі** склаліся добрыя адносіны.

Калгасу выдзелена абсталяванне, матэрыялы і інструменты, зроблена перасовачная сталовая, афармлена наглядная агітацыя, заканчваецца будаўніцтва двухкватэрнага дома. У гаспадарку з канцэртам выязджала агітбрыгада, праводзіліся сумесныя спартыўныя спаборніцтвы.

Выдатна папрацавалі нашы юнакі і дзяўчаты. У калгасе было адпрацавана больш 1500 чалавека-дзён, нарыхтавана 260 т сена, **800 т зялёнай масы, 370 т саломы.**

Камсамольцы аб'яднання аказалі дапамогу і іншым гаспадаркам вобласці — саўгасам **«Заазер'е»** Акцябрскага раёна, **«Хойнікі»** і **«Барысаўшчына»** Хойніцкага раёна. Імі нарыхтавана 630 т сена, 430 т саломы. Аказвалася дапамога ў праполцы гародніны, уборцы буракоў, бульбы, ільну.

З высокай прадукцыйнасцю працавала моладзь **цэхаў №№ 2, 6, 12 ГСКТБ.** У першых радах гэтых калектываў былі сакратары камсамольскіх арганізацый С. Губкін, В. Язерскі, В. Масцяпанаў, А. Яшын.

За 1983 год корманарыхтоўчы атрад нашага завода прызнаны лепшым у вобласці і яму быў уручаны пераходны прыз — крыштальная ваза.

Мы заключылі з падшэфнай гаспадаркай камсамольскі дагавор, вызначылі фронт работ і месца дыслакацыі атрада. **У пярвічных** камсамольскіх арганізацыях прайшлі сходы з парадкам дня: «Мой уклад у рашэнне Харчовай праграмы». Затым пачалася штодзённая работа: падбор і зацвярджэнне на пасяджэннях камітэта камісараў і камандзіраў, адпраўка кормаўборачных атрадаў, арганізацыя выезду агітбрыгады і падрыхтоўка нагляднай агітацыі, сустрэчы з вясковай моладзю, спартыўныя спаборніцтвы.

Існуючая сістэма заключэння камсамольскіх дагавароў з падшэфнымі гаспадаркамі, на жаль, яшчэ ў многім носіць фармальны характар. Аб'ёмы работ часта заніжаюцца. Зразумела, выканаць іх не цяжка. Маладым, працавітым рукам пад сілу і больш складаныя задачы.

Здзіўляюць пасіўныя адносіны моладзі, і перш за ўсё, камсамольскіх арганізацый калгасаў і саўгасаў да нас, сваіх шэфаў. Чаму б сельскім камсамольскім важакам не праявіць у адказ ініцыятыву: наладзіць быт, вольны час заводскіх юнакоў і дзяўчат, сумесна абмеркаваць далейшыя шляхі рашэння Харчовай праграмы?

**І. ГРЫГАРОВІЧ,**
**в. а. сакратара камітэта камсамола вытворчага аб'яднання «Гідрааўтаматыка».**

# «МАЯ ПРАЦА ЎЛІВАЕЦЦА Ў ПРАЦУ МАЁЙ РЭСПУБЛІКІ»

**Сапраўднай школай грамадзянскага сталення, школай гаспадарання** стала для нас, старшакласнікаў, летняя працоўная чвэрць пад дэвізам: «Мая праца ўліваецца ў працу маёй рэспублікі!». Вучні нашай школы прымаюць ў ей удзел з вялікім задавальненнем. За 11 гадоў у лагеры працы і адпачынку атрымалі працоўную загартоўку звыш 600 старшакласнікаў. За апошнія гады лагер «Бамавец» стаў адным з лепшых у горадзе.

У арганізацыі працоўнай чвэрці важная роля належыць камітэту камсамола. На яго пасяджэннях заслухоўваюцца ўсе жадаючыя паехаць у лагер працы і адпачынку. Давер'е аказваецца самым дастойным.

Мінулым летам мы ўпершыню арганізавалі атрад старшакласнікаў для работы ў сферы абслугоўвання. Назвалі яго «Равеснік». У атрадзе працавалі дзесяцікласнікі. Яны выязджалі ў піянерскі лагер «Лясная казка» нашага шэфа — вытворчага аб'яднання «Гомельдрэў». Тут дзяўчаты выконвалі разнастайную работу і за сваю старанную працу заслужылі падзяку дырэкцыі лагера.

Сёлета ў нашай школе былі створаны яшчэ два працоўныя атрады, якія выконвалі заказы філіяла ВА «Гомельдрэў» па вырабу каробак для запалак. Заданне выконвалася якасна. Заказчык застаўся задаволены. Таму ўзнікла ідэя працягваць гэту работу ўвесь навучальны год. У школьных майстэрнях ужо зроблена 45 тысяч каробак на 848 рублёў. Адначасова мы выконваем заказ сувязістаў, збіваем скрынкі пад пасылкі.

Нашы малодшыя таварышы, піянеры і акцябраты, таксама не засталіся ў баку ад карысных спраў. Яны вырабляюць папяровыя пакеты для завода «Чырвоны хімік».

**А. ГАРБУЗА,**
**сакратар камітэта камсамола СШ № 18.**

# ЎСЁ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ




«З майго рабочага месца пачынаецца ўзорны аддзел, калектыў прадпрыемства, горад». Пад такім дэвізам працуе камсамольска-маладзёжны калектыў магазіна № 38 імя XXVI з'езда КПСС. У яго састаў уваходзіць 45 чалавек. Усе яны імкнуцца да высокапрадукцыйнай працы, культуры абслугоўвання, перавыканання планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў.

Камсамольска-маладзёжны калектыў магазіна № 38 неаднаразова выходзіў пераможцам у спаборніцтве па аб'яднанню, у раёне і горадзе. Ён узнагароджваўся граматай Чыгуначнага райкома камсамола, ганаровымі граматамі Міністэрства гандлю БССР і БРК прафсаюза работнікаў гандлю і спажывецкай кааперацыі.

Члены камсамольска-маладзёжнага калектыву стварылі атрад «Клопаты і ўвага». Камсамольцы шэфствуюць над ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Уся моладзь КМК займаецца ў сістэме камсамольскай палітвучобы па курсу «Асновы камуністычнай маралі». 5 чалавек завочна вучыцца ў ВНУ і тэхнікумах.

**На здымку:** члены камсамольска-маладзёжнага калектыву магазіна № 38 Чыгуначнага райхарчгандлю (злева направа) Т. Белая, Т. Дзюбкіна, Л. Сяўрук.

# АДКАЗНАЕ ДАРУЧЭННЕ

Па ініцыятыве гаркома камсамола ва ўсіх вышэйшых навучальных установах г. Гомеля пачалі ствараюцца камсамольскія аператыўныя атрады дружыннікаў па барацьбе з правапарушэннямі, крымінальным злачынствам і раскраданнем сацыялістычнай маёмасці.

Адным з першых у Гомельскім дзяржаўным універсітэце такі атрад арганізавалі студэнты першых—чацвёртых курсаў эканамічнага факультэта. У яго саставе — 15 камсамольцаў.

Па графіку атрад штомесячна дзяжурыць разам з работнікамі міліцыі на вуліцах горада, у грамадскіх месцах: рэстаране «Беларусь», кафэ «Маладзёжнае», Палацах культуры аб'яднання «Гомельпрамбуд», упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва і інш. Члены аператыўнага атрада вядуць таксама выхаваўчую работу з цяжкімі падлеткамі, якія стаяць на ўліку ў дзіцячых пакоях міліцыі.

Аператрад ГДУ будзе праводзіць рэйды на прадпрыемствы г. Гомеля з мэтай выяўлення асоб, якія знаходзяцца на рабочых месцах у нецвярозым стане, а таксама ў магазіны, каб дэфіцытныя тавары не хавалі ад пакупнікоў у падсобных памяшканнях.

На мінулым тыдні сакратар камітэта камсамола ГДУ Вячаслаў Асіпенка ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў пасведчанні членам аператыўнага атрада. Гэтыя чырвоныя кніжкі яшчэ больш узмацнілі адказнасць кожнага камсамольца — удзельніка апер-атрада за выкананне важнага даручэння камсамола.

**І. ЖЫХАРАЎ,**
**камандзір аператыўнага атрада эканамічнага факультэта ГДУ.**

# У АРГАНІЧНЫМ СПЛАВЕ

Вернасць Радзіме, імкненне заўсёды і ва ўсім раўняцца на герояў старэйшых пакаленняў, памнажаць іх рэвалюцыйную, баявую і працоўную доблесць — адна з выдатных рыс нашай моладзі.

**Усесаюзны** паход па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа, у якім удзельнічаюць каля 80 тысяч юнакоў і дзяўчат, збор матэрыялаў для напісання «Летапісу народнай славы», удзел у аглядах-конкурсах абаронна-масавай і ваенна-спартыўнай работы — усё гэта садзейнічае ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі.

Праяўленнем сыноўняй павагі да подзвігаў старэйшых пакаленняў стаў удзел моладзі горада ў стварэнні «Летапісу народнай славы». Ужо запісана 12 тысяч успамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

У горадзе дзейнічаюць 4 раённыя універсітэты «Патрыёт», гарадскі клуб будучага афіцэра.

Камсамольскія і піянерскія арганізацыі г. Гомеля ўдзельнічаюць у аперацыі «Доўг», «Памяць», шэфствуюць над 109 абеліскамі і помнікамі, пастаянна папаўняюць экспазіцыі 180 музеяў і мемарыяльных пакояў.

Арганізацыя абаронна-спартыўных лагераў, правядзенне гульняў «Арлёнак», «Зарніца» і спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту, удзел у здачы норм ГПА, трывала ўвайшлі ў практыку работы па падрыхтоўцы моладзі да службы ў радах Савецкай Арміі і на флоце.

Гомель багаты спартыўнымі традыцыямі. Неаднаразова тут праводзіліся міжнародныя, усесаюзныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па розных відах спорту.

Гарадская фізкультурная арганізацыя налічвае ў сваіх радах звыш 198 тысяч чалавек. У сацыялістычным спаборніцтве паміж гарадамі Беларусі на лепшую арганізацыю фізкультурна-масавай, аздараўленчай і спартыўнай работы г. Гомель узнагароджан пераходным Чырвоным сцягам Савета Міністраў і Белсаўпрофа.

Значна ўмацавалася матэрыяльная база для заняткаў моладзі фізкультурай і спортам. Да паслуг юнакоў і дзяўчат прадастаўлены 137 спартыўных залаў, 7 плавальных басейнаў, 7 стадыёнаў, 47 цiраў. За 1982 і 1983 гады і за 11 месяцаў бягучага года пацвердзілі і выканалі норму майстра спорту міжнароднага класа 27 чалавек, падрыхтавана 120 майстроў спорту СССР, 513 кандыдатаў у майстры спорту СССР, 2880 спартсменаў I разрада, 244 тыс. спартсменаў масавых разрадаў, 210 тыс. юнакоў і дзяўчат выканалі норму Усесаюнзага фізкультурнага комплексу ГПА.

Гордасцю спартыўнага Гомеля ў 1984 годзе названы: двухразовы пераможца міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84» Віктар Пусееў, пераможцы еўрапейскіх першынстваў Н. Айвазян і Дзмітрый Грамыка, Алег Плотнікаў, чэмпіён краіны па боксу Андрэй Акулаў. Чэмпіёнкай свету па сучаснаму пяцібор'ю ў саставе зборнай каманды краіны стала Ж. Горленка.

**А. ЕРМАКОЎ,**
**загадчык аддзела абаронна-масавай і спартыўнай работы ГК ЛКСМБ.**



**НА ЗДЫМКУ:** у лютым бягучага года прайшоў Усесаюзны дзень лыжніка, у якім прыняло ўдзел больш 30 тысяч камсамольцаў г. Гомеля.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

АЗ 51729